10. Ozdemir, O. Quantifying cognitive and affective impacts of Quizlet on learning outcomes: a systematic review and comprehensive meta-analysis / O. Ozdemir, H. Seçkin // Frontiers in Psychology. – 2024. – Vol. 15. – P. 1–15.
11. Kohnke, L. Using Anki for vocabulary learning / L. Kohnke // RELC Journal. – 2023. – Vol. 54, No 3. – P. 781–785.
12. Using AnkiApp to Improve Students‘ Vocabulary Mastery in the Primary School Level [Электронный ресурс] // R Discovery. – 2025. – URL: https://rdiscovery.com (дата обращения: 10.04.2026). – Текст : электронный.
13. Pardamean, P. Improving English Vocabulary for Young Learners Through Memrise Application / P. Pardamean, D. Santoso // Excellence: Journal of English Education. – 2025. – Vol. 5, No 1. – P. 1–12.
14. Yandira, Y. Spaced Repetition and Multimedia Encoding in Digital Vocabulary Learning: Evaluating the Effectiveness of Memrise for Adolescent EFL Learners / Y. Yandira, M. Marzuki, A. E. Y. Abrar // Getsempena English Teaching Journal. – 2025. – Vol. 9, No 1. – P. 1–15.
15. Kaitsu, T. Analysis of smartphone-based flashcard apps for second language vocabulary acquisition / T. Kaitsu, T. Nakata // Computer Assisted Language Learning. – 2025. – P. 1–25.
16. Noji: Study Flashcards [Электронный ресурс] // Apps on Google Play. – 2025. – URL: https://play.google.com/store/apps/details?id=com.vedasapps.flashcards (дата обращения: 10.04.2026). – Текст : электронный.
17. WordTeacher [Электронный ресурс] // GitHub Repository. – 2026. – URL: https://github.com/soniccat/WordTeacher (дата обращения: 10.04.2026). – Текст : электронный.
18. Prastiti, K. C. Implementing English Augmented Reality Flashcards For Primary School Students: A Need Analysis / K. C. Prastiti, A. M. Rachmawati, N. I. Pratiwi, Y. Yulia, M. N. Wahid // Jurnal Pendidikan Bahasa Inggris. – 2025. – Vol. 13, No 2. – P. 1–10.
19. Aswita, M. The Relationship Between the Use of Digital Flashcards on Quizlet and English Vocabulary Mastery in Elementary School Students / M. Aswita, M. Moetia // IJoLTE. – 2025. – Vol. 9, No 1. – P. 1–12.
20. A comparison of vocabulary and collocation learning effects between Quizlet-based self-directed learning and teacher-directed instruction in elementary school English [Электронный ресурс] // KCI. – 2025. – P. 1–15. – URL: https://www.kci.go.kr (дата обращения: 10.04.2026). – Текст : электронный.

## FORMATION OF LEXICAL SKILLS IN PRIMARY SCHOOL CHILDREN USING ONLINE FLASH CARDS (BASED ON THE "SPOTLIGHT" COURSE BOOK)

*Vasilchenko E. A., Abakumova I. A.*
*Rostov-on-Don, Russia, SFU*

***Summary.*** *The article examines the effectiveness of online flash cards (Quizlet, Anki, Memrise, Brainscape) for developing lexical skills in primary school children. The experiment proved that digital flash cards improve vocabulary retention by 35–66% compared to traditional methods.*
***Keywords:*** *online flash cards; primary school children; spaced repetition; active recall; Quizlet.*

УДК 316.6:37: 004

## ЛІЧБАВАЯ РЭПУТАЦЫЯ ПЕДАГОГАЎ СУЧАСНАЙ АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ

*Васюковіч Л. С.*
*Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*ВДУ імя П. М. Машэрава*

**Анатацыя.** *У артыкуле аналізуецца лічбавая рэпутацыя як грамадская ацэнка кампетэнцый, неабходных педагогу для эфектыўнага і бяспечнага выкарыстання рэсурсаў інтэрнэту. Індыкатарамі паспяховай лічбавай рэпутацыі выступаюць: інтэграцыя тэхналогій, сутнасныя змены статусных суб'ектаў адукацыйнай сферы, актуалізацыя аксіялагічнага і выхаваўчага кампанентаў адукацыйнага працэсу, культура зносін у інтэрнэт-асяроддзі.*
**Ключавыя словы:** *лічбавая рэпутацыя; лічбавыя навыкі; індыкатары лічбавай рэпутацыі педагога.*

**Уводзіны.** Сучаснае лічбавае грамадства ўяўляе сабой новы ўзровень развіцця, які вызначаецца “анлайнізацыяй” усіх сфер жыцця. Лічбавізацыя адукацыі характарызуецца пранікненнем у прафесійную дзейнасць выкладчыка новых тэхналогій, якія дазваляюць існі ў

нагу з часам і фарміраваць якасці навучэнцаў, адпаведныя запытам соцыуму. *Мэтай артыкула* з’яўляецца абгрунтаванне індыкатараў паспяховай лічбавай рэпутацыі як ключавой кампетэнцыі педагога ў працэсе камунікацыі з інтэрнэт-пакаленнем.

Як вядома, лацінскае слова рэпутацыя азначае ўстойлівы вобраз, сфарміраваную грамадскую думку пра станоўчыя/адмоўныя якасці асобы/арганізацыі на аснове вопыту кантактавання з імі. Лічбавая рэпутацыя выкладчыка падразумявае ўменні, неабходныя для эфектыўнага і бяспечнага карыстання сучаснымі тэхналогіямі і рэсурсамі інтэрнэту. Гэта здольнасць шукаць, структураваць неабходную інфармацыю, крытычна ўспрымаць, адэкватна разумець, ствараць, ацэньваць, задзейнічаць мультымедыйны кантэнт, магчымасці сацыяльных сетак, анлайн-сервісаў з адукацыйнымі і жыццёвымі мэтамі. *Актуальнасць* даследавання прадвызначаецца неабходнасцю фарміраваць “лічбавы” вопыт ва ўмовах сучаснай адукацыі, які папярэджвае дысбаланс паміж кампетэнцыямі педагога і мультымедыйнымі навыкамі студэнтаў.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужыла навукова-метадычная літаратура па праблеме даследавання, інтэрпрэтацыя і абагульненне педагагічнай практыкі. Выкарыстаны комплекс метадаў – тэарэтычных (сінтэз навуковых пазіцый айчынных і расійскіх даследчыкаў), эмпірычных (вывучэнне нарматыўна-прававых дакументаў сферы адукацыі, аналіз педагагічнага вопыту).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Развіццё інфармацыйнай пісьменнасці, медыяграматнасці навучэнцаў, навыкаў гарманічнага супрацоўніцтва ў інтэрнэт-прасторы, праверка інфармацыі на дакладнасць і верагоднасць, здольнасць ствараць лічбавы кантэнт – базавыя ўменні сучаснага выкладчыка. Індыкатарамі паспяховай лічбавай рэпутацыі педагога выступаюць:

–*інтэграцыя тэхналогій*, цэласныя паказчыкі якасці адукацыі, якія адлюстроўваюць “запыты асобы, грамадства і дзяржавы, патрабаванні рынку працы, інтарэсы ўсіх суб’ектаў адукацыйнага працэсу” [5, с. 9] . Новыя вектары ў развіцці грамадства актуалізуюць не толькі кагнітыўны, але найперш асобасны, сацыяльны і практыка-арыентаваныя кампаненты сістэмы навучання. Абнаўляецца сацыяльная састаўная, што праецыруе самавызначэнне асобы, асэнсаванне ўласных дасягненняў у калектыве. Пры гэтым “практычны кампанент абумоўліваецца назапашваннем сацыяльнага і культурнага вопыту навучэнцаў” [2, с. 15];

– *сутнасныя змены статусных суб’ектаў адукацыйнай сферы* – як навучэнцаў, так і тых, хто вучыць. У сённяшніх умовах трансфармуецца функцыянал сучаснага педагога. Так, традыцыйныя адносіны паміж выкладчыкам вышэйшай школы і навучэнцамі пераважна выбудоўваліся ў аўтарытарным кантэксце: педагог, які аднаасобна валодае інфармацыяй, і студэнт, які ў інфармацыйным плане залежны ад выкладчыка. Імператывы сённяшняга соцыуму змяняюць традыцыйны статус педагога, які набывае рысы арганізатара працэсу пазнання, менеджара, эксперта, здольнага прафесійна і аб’ектыўна ацэньваць пазнавальную, праектную, даследчую дзейнасць навучэнцаў;

*актуалізацыя аксіялагічнай састаўной лічбавай адукацыі*. Аксіялагізацыя працэсу пазнання служыць гарантам таго, што сучасная школьная сістэма здольная выхаваць дзяцей лічбы як актыўных носьбітаў духоўнасці, патрыятычна скіраваных грамадзян з актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Лічбавы кантэнт не павінен засланіць ролі гуманістычнага складніка, якім заўсёдна вызначалася айчынная школа. Змест вучэбных прадметаў закліканы захаваць культурны код нацыі, прывіць навучэнцам традыцыйныя духоўна-маральныя каштоўнасці. Сістэма адукацыі, безумоўна, павінна быць адкрытай да супрацоўніцтва, да засваення сучасных метадычных трэндаў, аднак трэба разумна “адаптаваць міжнародныя практыкі, падпарадкоўваць іх нацыянальным інтарэсам і культурным традыцыям” [1, с. 10], што дапаможа засцерагчыся ад неапраўданага запазычвання.

Аксіялагізацыя сучаснай адукацыі падразумявае:

– асэнсаванае захаванне нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей, калектыўнай памяці, якая перадаецца ад пакалення да пакалення (знакавыя асобы / падзеі, тэксты культуры, кнігі, помнікі, музеі, фільмы, што фарміруюць станоўчы вобраз мінулага) і здольная аб’яднаць народ у адзінае цэлае;

– развіццё здольнасці доказна і карэктна выяўляць уласныя каштоўнасныя арыентацыі і светапоглядныя пазіцыі;

– засваенне ключавых канцэптаў, якія акумулююць калектыўна прызнаныя базавыя паняцці (*Радзіма, праца, доўг, здароўе, жыццё, мір, сяброўства, павага* і інш.);

– *узмацненне статусу камунікатыўнай* кампетэнтнасці, якую нельга звесці да сумы ведаў і ўменняў. Гэта і матываванасць свядомай дзейнасці, уменне самастойна вырашаць вучэбныя і жыццёвыя задачы, і адказнасць за ўласныя словы, справы, паводзіны. Гэта комплекс характарыстык, што вызначаюць уменне асобы планаваць уласную дзейнасць, час і рэсурсы дзеля дасягнення мэты. Як вядома, камунікатыўна кампетэнтнага чалавека рэпрэзентуюць якаснае чытанне, лагічнае і эмацыйнае гаварэнне, змястоўны інтэлігентны дыялог, здольнасць ствараць уласныя арыгінальныя тэксты. Адпаведныя якасці кампетэнтнай асобы фарміруюцца з мэтай паўнацэннага ўзаемадзеяння ў соцыуме;

– паспяховую лічбавую рэпутацыю педагога забяспечвае *культура зносін у інтэрнэт-асяроддзі*. Пытанні культуры маўленчай камунікацыі найчасцей абмяркоўваюцца ў адносінах да дзяцей і падлеткаў, але гэтая праблема актуальная і для педагогаў, якія актыўна выкарыстоўваюць лічбавыя сервісы для навучання ў рэжыме анлайн, вядуць уласныя блогі, асабістыя старонкі ў сацыяльных сетках, ствараюць платформы дыстанцыйнага навучання, сайты для кантактавання з калегамі і навучэнцамі.

У сучаснай няпростай сітуацыі ў інтэрнэце можа свядома распаўсюджвацца хаатычная, некарэктная і непраўдзівая інфармацыя. У гэтых умовах неад'емнай часткай выхавання карыстальніка лічбавай сферы з'яўляецца наяўнасць навыкаў крытычнага мыслення. Варта пераканаць навучэнцаў: дэталёвае прадумванне выступлення, суправаджэнне яго прэзентацыяй і відэаматэрыяламі дазволіць адчуваць сябе ўпэўнена, пазбегнуць некарэктных сітуацый падчас зносін, напрыклад, у кантэксце відэаканферэнц-сувязі. Трэба падказаць навучэнцам адпрацоўваць арфаэпічныя і акцэнталагічныя нормы, старацца гаварыць выразна, правільна расстаўляць акцэнты. Варта шліфаваць аратарскае майстэрства, развіваць навыкі вербальных і невербальных зносін. Важна навучыць маладое пакаленне назіраць за ўласным маўленнем, дыкцыяй і эмацыянальнай афарбоўкай голасу. Можна параіць удзельнікам анлайн-сустрэч загадзя запісаць сваю прамову на камеру, пераўтварыцца ў староннягa назіральніка, адпрацаваць заўважаныя недахопы.

Педагог лічбавай эпохі павінен валодаць методыкай распрацоўкі адукацыйных праграм для дзяцей і студэнтаў, што ўтрымліваюць рэкамендацыі па бяспечным карыстанні інтэрнэтам і інфармацыю пра рызыкі і наступствы грумінгу. Падобная праца падразумявае развіццё крытычнага мыслення карыстальнікаў інтэрнэту. Педагог вучыць выхаванцаў дэталёва аналізаваць сеткавую інфармацыю, звяртацца да розных крыніц з мэтай праверкі яе аб'ектыўнасці і верагоднасці, прывівае навучэнцам элементарную медыяграматнасць. Неабходна сфарміраваць уменне карыстацца лінгваэнцыклапедычнымі слоўнікамі, даведнікамі, выхоўваць патрэбнасць пастаяннага звароту да іх, уменне інтэрпрэтаваць змест і структуру электронных тэкстаў. Праца можа набываць розныя формы: кампазіцыйна-зместавы аналіз тэкстаў, перавод візуальнай інфармацыі ў вербальную, складанне анатацый, рэцэнзій на навуковыя выданні, рэдагаванне і трансфармацыя тэкстаў, іх згортванне і разгортванне, падрыхтоўка бібліяграфічных спісаў, вылучэнне і характарыстыка структурных кампанентаў тэксту: факты, меркаванні, тэарэтычныя палажэнні, аргументы, ілюстрацыйныя прыклады, цытаванне іншых крыніц, запатрабаванасць графічнай інфармацыі, наяўнасць спасылак, іх афармленне і інш.

Неабходна прызнаць: інтэрнэт-асяроддзе – рэальнасць, якая "з аднаго боку, адкрывае шырокія магчымасці для зносін паміж людзьмі ў глабальных маштабах, з другога – нясе пэўную небяспеку і складанасці" [3, с. 85]. У асяроддзі інтэлектуальных сістэм, здольных у пэўнай меры імітаваць кагнітыўныя функцыі чалавека, неабходна выпрацаваць імунітэт да ўсяго шаблоннага, стандартнага і рабіць акцэнт на творчай састаўной сучаснай адукацыі, праяўляць павышаную ўвагу да развіцця лагічнага і вобразнага мыслення навучэнцаў, імкнуцца кожную дыдактычную задачу пераводзіць у ранг камунікатыўнай. Запатрабаваныя ў гэтым кантэксце заданні, скіраваныя на развіццё культуры мыслення і маўлення ў лічбавым фармаце. Напрыклад:

*Вы прачыталі ў інтэрнэце наступную інфармацыю: "Прапаную працу. Зручны, выгадны графік. Высокая аплата. Цудоўныя ўмовы для адпачынку. Стабільныя прэміі і даплаты. Пішыце ў лічку".* Студэнты павінны ставіцца крытычна да падобных паведамленняў, рацыянальна аналізаваць іх: *У якой ступені вы давяраеце падобным абвесткам? Якая інфармацыя павінна насцярожыць вас у такой сітуацыі? З якой мэтай адпраўляецца такая інфармацыя? Ці варта адназначна верыць інтэрнэт-прапановам? Ці адказвалі б на гэтае паведамленне? Калі прымеце рашэнне адгукнуцца на інфармацыю, якім будзе ваш адказ?*

*Уявіце, што вы ўжо працуеце самастойна ў школе. Вы ведзяце ўласную старонку ў сацыяльнай сетцы. У вас з'явілася жаданне размясціць навіны аб сваёй прафесійнай дзейнасці, аб поспехах і дасягненнях вашых навучэнцаў. Прадумайце тэкст вашага паведамлення, характар яго суправаджэння відэа, фотаздымкамі, смайлікамі і стыкерамі. Прад'явіце два/тры варыянты навін з рознымі стылямі падачы вербальнай і невербальнай інфармацыі. Папрасіце вашых аднагрупнікаў ацаніць прапанаваныя вамі варыянты. Якім чынам вы будзеце рэагаваць на станоўчыя/адмоўныя водгукі калег?*

*Вы – класны кіраўнік 9-га класа. Да вас звярнуўся вучань з просьбай даць параду: у сацыяльнай сетцы ён падвяргаецца ананімнаму кібербулінгу. Ужо былі спробы блакіраваць падобныя паведамленні, аднак кожны раз прыходзяць новыя пісьмы. Што вы прапануеце вучню? Якія канкрэтныя парады сфармулюеце? На аснове чаго? Якая стратэгія паводзін у гэтай сітуацыі будзе, на вашу думку, найбольш рацыянальнай?*

*Якім чынам вы будзеце пераконваць сваіх маладых падпісчыкаў, што лічбавая культура выступае часткай агульнай культуры, якая адлюстроўвае каштоўнасці, маральныя ўстаноўкі і перакананні асобы? Прапануйце для сваіх выхаванцаў топ-5 інтэрнэт-рэсурсаў з прафесійнымі, выверанымі матэрыяламі, скіраванымі на выхаванне культуры зносін у інтэрнэт-прасторы.*

*Абгрунтуйце ўласную пазіцыю адносна ўжывання маладзежнага слэнгу. Некаторыя педагогі лічаць: каб быць з моладдзю на адной хвалі, трэба дазваляць сабе гаварыць на мове сучаснага студэнцтва. Іншыя цвёрда перакананы: педагог павінен быць узорам вобразнага літаратурнага маўлення, не дазваляць заігрывання, уставак "модных" элементаў. Прывядзіце тры аргументы <u>за</u> і <u>супраць</u> да кожнай прапанаванай пазіцыі .*

Лічбавая рэпутацыя выкладчыка ўключае *выхаваўчую састаўную, скіраваную на падрыхтоўку патрыётаў, адданых сваёй краіне*. Так, каштоўнаснай асновай для фарміравання вобраза Радзімы павінны выступаюць: *сям'я* як аснова патрыятычнага, грамадзянскага выхавання; *рэальныя аб'екты*, што раскрываюць унікальнасць прыродна-геаграфічнага ландшафту, яго ўплыву на жыццё і характар насельніцтва; *духоўныя набыткі* як культурны код беларусаў, які захоўвае эстэтычныя і маральныя ідэалы; наша *гісторыя*, якая акумулюе пошукі ідэнтычнасці, вопыт станаўлення нацыянальных каштоўнасцей, іх ролю ў сусветнай прасторы; *пантэон нацыянальных герояў*, чые подзвігі з'яўляюцца ўзорам высокага служэння Айчыне. Гэтая матрыца выступае зместавай асновай для патрыятычнага выхавання, падразумявае фарміраванне не толькі ведаў, але і эмацыянальна афарбаваных уяўленняў пра гісторыю, культуру, прыроду Беларусі.

Сучаснаму педагогу трэба прыкласці намаганні для атрымання выхаванцамі якаснай адукацыі, папярэджвання акадэмічнага махлярства студэнтаў, што праяўляецца ў распаўсюджаных фактах запазычвання матэрыялаў. Так, сярод удзельнікаў лангіцюднага даследавання (1149 студэнтаў) адзначаецца "распаўсюджанасць спісвання і плагіяту: кожны трэці студэнт лічыць, што большасць аднагрупнікаў звяртаюцца да падобнай формы падрыхтоўкі курсавых, дыпломных, экзаменацыйных заданняў. … Пры гэтым толькі палова студэнтаў высока ацэньваюць верагоднасць праверкі выкладчыкам работы на наяўнасць плагіяту" [6, с. 113]. У кантэксце падобных з'яў істотная актыўная пазіцыя выкладчыка, якая "працуе" на яго акадэмічную рэпутацыю і прафесіянальны статус. З гэтай мэтай пры вусных адказах трэба фарміраваць асэнсавана-аналітычныя адносіны да выкарыстаных крыніц інфармацыі, аб'ектыўна дыферэнцаваць прапанаванае штучным інтэлектам і самім студэнтам. Для гэтага, як справядліва лічыць Т.А. Печанёва, варта "не дазваляць узнаўляць у рэфератах, дакладах, аглядах безаблічны, «універсальны" матэрыял і выстаўляць адзнаку з улікам адказаў на пытанні" [4, с. 107].

Характэрнае недаацэньванне сучаснымі студэнтамі ведаў у галіне гісторыі педагогікі. Асэнсаванне педагагічнай спадчыны як цэласнага свядомага ўспрымання гістарычнага мінулага фарміруе аб'ектыўныя адносіны да культурных традыцый як прыярытэтнага кампанента адукацыйных праграм. Гісторыка-педагагічныя веды неабходныя для дыялектычнай ацэнкі сучасных рэалій. Яны выступаюць асновай духоўна-маральнай экспертызы разнастайных навацый, вызначэння іх каштоўнаснага ядра. Ігнараванне гісторыка-педагагічнага складніка з'яўляецца прыметай метадалагічнай нявопытнасці маладых людзей, паколькі сучаснасць мыслення заключаецца не ў механічным адмаўленні чужога вопыту, а ў творчым засваенні яго ўрокаў і прымяненні для рашэння актуальных праблем.

Аптымальны кантэкст функцыянавання традыцый – у гарманізацыі мінулага і новага вопыту, у інтэграцыі ідэй, якія прайшлі праверку часам і практыкай. Гісторыка-педагагічная спадчына засноўвае фундамент нацыянальнай культуры як сукупнасці духоўных і матэрыяльных здабыткаў. Будучыя настаўнікі ў працэсе прафесійнага станаўлення спасцігаюць найбольш каштоўнае з калектыўнай мудрасці, што выступае ўмовай "прырашчэння" культуры пакалення, якое вызначае заўтрашні дзень грамадства. Веданне гісторыі дапамагае зразумець сутнасць сённяшніх з'яў і працэсаў. Гэтаму маладое пакаленне можа навучыць толькі выкладчык з устойлівай лічбавай рэпутацыяй, здольны творча адаптаваць лічбавыя рэсурсы пад канкрэтную задачу, інтэграваць іх у адукацыйны працэс, зрабіць яго змястоўным, інтэрактыўным, насычаным сэнсава-каштоўнаснымі ацэнкамі, жывымі зносінамі, дыскусіямі, пошукамі, якія немагчыма замяніць жыццём у віртуальнай прасторы.

**Заключэнне.** Такім чынам, лічбавая рэпутацыя сённяшняга выкладчыка – гэта сістэма базавых ведаў, навыкаў і ўстановак у сферы прафесійнага выкарыстання сучасных тэхналогій. Рэпутацыя педагога заснавана на ўменнях фармуляваць інфармацыйныя запыты, шукаць неабходныя дадзеныя, структураваць іх, распрацоўваць паспяховыя індывідуальныя маршруты. Лічбавая рэпутацыя выкладчыка павінна праецыраваць кантэкст самаразвіцця навучэнцаў, што падразумявае здольнасць да дыдактычных мадыфікацый адукацыйных рэсурсаў, да выбудоўвання стратэгій ацэньвання, рэфлексійных практык, наладжвання зваротнай сувязі. Ігнараванне патрабаванняў да лічбавай рэпутацыі ўтрымлівае рызыку разбурэння гармоніі ў адукацыйна-выхаваўчым узаемадзеянні.

Лічбавая рэпутацыя як набор кампетэнцый, неабходных для эфектыўнага выкарыстання сучасных тэхналогій, як здольнасць знаходзіць, ствараць, ацэньваць  кантэнт, можа развівацца ў трох аспектах:

– *кагнітыўны*, які выяўляецца праз веды і ўменні крытычна падыходзіць да працы з інфармацыяй, праз адэкватнае ацэньванне сучасных тэхналогій, асэнсаванне іх пераваг і недахопаў у прыняцці стратэгічных рашэнняў;

– *практычны*, што рэалізуецца праз уменні знаходзіць якасную, актуальную інфармацыю, праз тэхнічныя навыкі, уразуменне таго, "як гэта працуе";

– *этычны*, які раскрывае маральныя ўстаноўкі асобы, агульнапрынятыя нормы камунікавання ў лічбавай прасторы.

Такім чынам, лічбавая рэпутацыя педагога праяўляецца як у здольнасці прымяняць тэхналогіі ў адукацыйным працэсе, так і ў рэалізацыі дыялогавага рэжыму кантактавання з калегамі, навучэнцамі, іх бацькамі, педагагічнай супольнасцю. Пры любым развіцці стратэгій лічбавай адукацыі нязменнай каштоўнасцю на фоне глабалізацыі рэсурсаў застаецца і застанецца прафесіяналізм педагога, высокая місія ў развіцці і выхаванні маладога пакалення. Разам з неабходнасцю павышаць статус выкладчыка варта гаварыць і пра рост патрабаванняў да яго асобасных маральных якасцей, лічбавых і каштоўнасна-сэнсавых кампетэнцый. У сённяшніх умовах важна рыхтаваць педагога новай фармацыі, здольнага, як і стагоддзі таму, далучаць сваіх выхаванцаў да творчай, даследчай дзейнасці, дапамагаць адчуваць радасць маленькіх адкрыццяў, ствараць сітуацыі поспеху, вучыць адэкватна ацэньваць уласныя дасягненні і няўдачы.

*Статья выполнена в рамках научно-исследовательской темы БелИСА «Гуманитарные науки как фактор сохранения и укрепления ценностного суверенитета белорусского государства» (№ гос. рег.: 202678 от 18.02.2026).*

Спіс літаратуры

1. Архипова Е. В. Аксиологические задачи обучения русскому языку в суверенной системе образования России/ Е. В. Архипова, Л. В. Лагунова // Отечественная и зарубежная педагогика. – 2025. – Т. 2. –№ 2. – С. 7–19.

2. Васюковіч, Л. С. Праца з тэкстам як аснова фарміравання функцыянальнай пісьменнасці вучняў: манаграфія /Л. С. Васюковіч. – Віцебск: ВДУ імя П. М. Машэрава, 2024. – 177 с.

3. Коммуникативная культура педагога и руководителя в цифровую эпоху / Д. З. Ахметова, А. В. Тимирясова, Т. А. Челнокова [и др.]. – Казань : Познание, 2023. – 187 с.

4. Печенева, Т. А. Педагогика для «цифрового поколения»: пути развития информационно-аналитических компетенций студента /Т. А. Печенёва. – Минск : Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2022. – 182 с.

5. Развитие системы оценки качества образования в Республике Беларусь. Общее среднее образование /М. Б. Горбунова [и др.]; под науч. ред. В. Ф. Русецкого. – Минск : НИО, 2022. – 390 с.
6. Шмелева, Е. Д. Академическое мошенничество студентов / Е. Д. Шмелева, Т. В. Семенова // Вопросы образования. – 2019. – № 3. – С. 101-119.

## DIGITAL REPUTATION OF A TEACHER IN THE MODERN EDUCATIONAL SPACE

*Vasyukovich L. S.*
*Vitebsk, Republic of Belarus*
*VSU named after P. M. Masherov*

***Summary.*** *This article analyzes digital reputation as a social assessment of a teacher's competencies necessary for the effective and safe use of internet resources. Indicators of a successful digital reputation include: technology integration, fundamental changes in the status of educational actors, the updating of the axiological and educational components of digital education, and the culture of relationships in the online space.*
***Key words:*** *digital reputation; digital skills; indicators of a teacher's digital reputation.*

УДК 81-115

## ОБРАЗНЫЕ ПРИЗНАКИ КОНЦЕПТОВ «ПРАВДА», «ИСТИНА», «TRUTH» В СОПОСТАВИТЕЛЬНОМ АСПЕКТЕ (НА БАЗЕ АНГЛИЙСКОГО И РУССКОГО ЯЗЫКОВ)

*Воеводина А. В.*
*Горловка, Российская Федерация*
*ДГПУ имени В. Шаталова*

***Аннотация.*** *Статья посвящена сопоставительному анализу образных признаков культурных концептов «правда», «истина», «truth», объективированных в русской и английской языковых картинах мира.. Национальная специфика отражает особенности каждого народа.*
***Ключевые слова***: *концепт; языковая картина мира; фразеология; правда; истина.*

**Введение.** Рост интереса лингвистики к изучению концептуализации действительности и исследованию лексического состава языка в когнитивном аспекте, а также особая значимость сопоставительного изучения фразеологических систем разных языков для выявления и исследования особенностей мышления, восприятия мира и культурных ценностей народов обуславливают **актуальность** данной статьи.

**Цель статьи** – выявить образные признаки концептов *правда, истина* в языковой картине мира носителей русского языка и концепта *truth* в языковой картине мира носителей английского языка.

**Материал и методы.** На материале русского языка исследованию концептов правда, истина посвящены работы Н.Д. Арутюновой (1998), В.В. Колесова (2002), С.Е. Никитиной (1995), М.В. Пименовой (2003), Ю.С. Степанова (1972, 1997), А.Д. Шмелева (2002). Концепт truth на базе английского языка являлся предметом изучения Т.А. Хромовой (2000, 2002), А.И. Полторацкого (1995). В свете проблем языкознания слово truth исследовали A. Gupta (1987), G.L. Hallett (1988), H.Kamp (1981), E.L. Keeran (1983), G. Lakoff, M. Gohnson (1980), R.M. Martin (1958), J.M. Sadock (1977), F. Sommers (1969), K. Taylor (1998), R.H. Thomason (1976) [1]. Материалом настоящего исследования являются данные сплошной выборки из словарей фразеологизмов английского и русского языков, словарей пословиц и поговорок, словарей идиом. Основными методами, используемыми в работе, являются описательный метод, метод этимологического анализа, метод сравнения и обобщения.

**Результаты и обсуждение.** Задача лингвокультурологии заключается в системном представлении единиц языка и культуры в их взаимосвязи. При лингвокультурологическом анализе значения культурно детерминированных единиц соотносится с концептами национальной культуры, и им дается глубинное и объемное объяснение [2]. Предметом исследования лингвокультурологии является паремиологический фонд языка, поскольку большая часть пословиц представляет собой стереотипы народного сознания. При этом изучать необходимо только те паремии, которые этимологически и функционально неразрывно связано с историей, культурой, бытом, моралью определенного народа либо этноса.